вёска ў Навагрудскім р-не). Аўтар паэмы «Шчорсы» (1784), вершаванага пераладжэння фрагмента рамана Ж.Ф.Мармантэля «Інкі, або Знішчэнне Перу» («Перуанскія гімны смерці», 1785), віншавальных вершаў, перакладаў. Ёй прыпісваюць таксама пераклад драмы А. фон Кацэбу «Бянёўскі».

**ГЛІНСКІ** Іаахім (1853, в. Будслаў Мядзельскага р-на — 16.3.1898), беларускі спявак, арганіст і кампазітар. Вучыўся ў Пецярбургскай кансерваторыі. Працаваў арганістам у Гродне і Вільні. Пісаў п'есы, музыку на словы А.Міцкевіча і У.Сыракомлі, танцы і маршы, оперу «Паята» на сюжэт з літоўска-бел. гісторыі (не скончана).

**ГЛІНСКІХ** Яўген Міхайлавіч (11.1. 1922, Масква — 25.11.1985), беларускі артыст балета. Засл. артыст Беларусі (1954). Скончыў студыю пры Свярдлоўскім тэатры оперы і балета (1937). Працаваў у Расіі. У 1949—57 вядучы танцоўшчык Дзярж. тэатра оперы і балета Беларусі. Адначасова ў 1952—69 выкладаў у Бел. харэагр. вучылішчы. Артыст лірыка-драм. плана, выдатна валодаў мастацтвам дуэтнага танца. Сярод партый на бел. сцэне: Зігфрыд, Дэзірэ («Лебядзінае возера» і «Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Альберт («Жызэль» А.Адана), Феб, Іванушка («Эсмеральда» і «Канёк-Гарбунок» Ц.Пуні), Базіль («Дон Кіхот» Л.Мінкуса) і інш.

**ГЛОБУС** Адам (сапр. Адамчык Уладзімір Вячаслававіч; н. 29.9.1958, г. Дзяржынск), беларускі пісьменнік. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1983). Працаваў мастаком-рэстаўратарам, мастаком-афарміцелем, у час. «Крыніца» і «Бярозка». Аўтар кніг паэзіі «Парк» (1988), «Скрыжаванне» (1993), прозы «Адзінота на стадыёне» (1989), «Дамавікамерон» (1994), «Толькі не гавары маёй маме» (1995) «Новы дамавікамерон» (1998), «Тэксты» (2000), «Сшыткі» (2003), «Сучаснікі» (2006), «Play. Ву» (2009), і інш., рамана «Дом» (2005). У творах Г. адчуваецца асэнсаванне вопыту заходнееўрап. і паўночнаамер., стараж.-японскай і кітайскай л-р. Піша танка і хоку. *І.М.Гоўзіч.*

**ГЛОГЕР** (Gloger) Зігмунд (3.11.1845, в. Камёнка Ломжынскага павета Падляскага ваяв., Польшча — 15.8. 1910), польскі археолаг, этнограф, гісторык, фалькларыст. Вучыўся ў Варшаўскім ун-це. Скончыў Кракаўскі ўн-т (1870). Зрабіў шмат фалькл.-этнаграф. і краязнаўчых экспедыцый па Польшчы, Беларусі, Літве. Аўтар прац: «Вясельныя ўрачыстасці» (1869), «Гістарычная геаграфія зямель даўняй Польшчы» (1900), дзе змясціў бел. матэрыялы з Брэсцкага і Троцкага паветаў, матэрыялы пра ВКЛ, Беларусь і інш. Пра жыццё, звычаі, абрады і вераванні бел. народа пісаў у арт. «Земляробчыя абрады» (1867), «Звычаі народа з ваколіц Тыкоціна і Бельска» (1868), «Забабоны і ўяўленні наднарвенскага люду пра птушак, паўзуноў і насякомых» (1877) і інш. Бел. матэрыялы і ў працах пра краязнаўчыя падарожжы (кн. «Далінамі рэк: апісанні падарожжа ўздоўж Нёмана, Віслы, Буга і Бебжы», 1903; арт. «Падарожжа Нёманам», 1888, «На хвалях Буга», 1890, «У даліне Бебжы», 1892, і інш.). У «Старапольскай энцыклапедыі» (т. 1—4, 1900—03, 5-е выд. 1985) змясціў каля 1000 іл., шматлікія бел. матэрыялы па гісторыі, геаграфіі, драўлянай і мураванай архітэктуры, кнігадрукаванні, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Даследаваў помнікі археалогіі каменнага і бронзавага вякоў на Гродзеншчыне, Брэстчыне.

*Тв.:* Notatki archeologiczne Micha a Federowskiego z okolic S onima. Kurhany pod Wiszowem.Warszawa, 1882.

**«ГЛОС З ЛІТВЫ»** («Glos z Litwy», «Голас з Літвы»), падпольная газета перыяду паўстання 1863—64 у Польшчы, Беларусі і Літве. Выходзіла 1.2—1.4.1864 ва Усх. Прусіі ў Кёнігсбергу (цяпер г. Калінінград, Расія; на нумарах у якасці месца выдання пазначалася Вільня) на польск. мове